МАСТОЎСКАЯ РАЁННАЯ ГАЗЕТА

Зара над Нёманам

www.mosty-zara.by

ГАЗЕТА ВЫДАЕЦЦА З 1945 ГОДА

№87 (8797)

СЕРАДА, 12 лістапада 2014 года

Цана 1200 руб.

Проект закона «О борьбе с коррупцией» – на общественном обсуждении

В соответствии с поручением Президента Беларуси, на общественное обсуждение вынесен проект закона «О борьбе с коррупцией». Проект документа определяет механизмы предупреждения коррупции, в том числе ограничения, устанавливаемые для должностных и приравненных к ним лиц, регулирует порядок декларирования доходов и имущества таких лиц, закрепляет меры по противодействию коррупции.

Электронная версия документа доступна на интернет-сайте Генеральной прокуратуры и Национальном правовом интернет-портале Беларуси. Свои замечания и предложения можно направить в редакцию газеты «Советская Белоруссия», а в электронном виде - на интернет-сайт Генеральной прокуратуры и Национальный правовой интернет-портал Беларуси.

А. ЛУКАШЕНКО: Не переношу воров и грабителей

Работа по борьбе с коррупцией ведется в Беларуси постоянно. Об этом заявил Президент Беларуси Александр Лукашенко на пресс-конференции для представителей российских региональных средств массовой информации.

«Еще до своего президентства я возглавлял комиссию по борьбе с коррупцией. Я внутренне не переношу воров, грабителей и прочих. Поэтому работа по борьбе с коррупцией ведется нами постоянно. Но мы не планируем совершать переворот в законодательстве. Мы будем его совершенствовать каждый час», - отметил он.

В настоящее время в Беларуси идет всенародное обсуждение проекта закона о борьбе с коррупцией. «Общество предлагает много интересных и толковых предложений. Я обратился к народу, потому что закон пишут и готовят чиновники. А они, по нашим исследованиям, занимают второе место в коррупционных проявлениях. Поэтому хотелось бы услышать мнение рядовых граждан. Лучшие идеи будут внесены в законопроект. Что останется, народ будет видеть. У меня нет договоренностей с жуликами - это внесем, это не внесем», - подчеркнул белорусский лидер.

Александр Лукашенко отметил, что со временем появляются новые проявления в коррупции, которые не учтены в законе, поэтому возникает необходимость совершенствовать нормативно-правовую базу.

«Жизнь многогранна, появляются новые коррупционные явления. Мы не в первый раз модернизируем законодательство. Я занимаюсь этим вопросом еще и потому, что давно усвоил: какие бы ты реформы не проводил, если в стране высокий уровень коррупции - это испорченное общество и, как результат, например, в Украине, беда, - уверен Президент. - Коррупция, как ржавчина, разъедает любую сферу общества, будь-то экономика или социальная жизнь».

«Никто не сможет привести хотя бы один факт, что я делаю в борьбе с коррупцией одно, а для себя что-то делаю другое. Никто в стране или за рубежом не скажет, что я у кого-то что-то взял. Для меня и моих детей это чуждо», - подчеркнул Александр Лукашенко.

Президент уверен, что в стране могут быть идеальные законы, но, если первое лицо в государстве будет коррумпировано, зло будет процветать. «Власть и все ее окружение должны быть абсолютно чистыми. Никому потом пощады не будет. Но я очень боюсь, что где-то будет перебор. Поэтому я предупредил председателя КГК, чтобы не было обвинительного уклона - только по конкретному факту», - добавил он.

(Начало. Продолжение на 2-й стр.)

Агранавіны

Належная ўвага - жывёлагадоўлі

Учора на базе гаспадарак Мастоўскага раёна прайшоў абласны семінар-нарада. Ён быў прысвечаны вынікам работы галіны жывёлагадоўлі за 10 месяцаў 2014 года і выкананню праграмы па нарошчванню вытворчасці свініны ў Гродзенскай вобласці.

Да ўдзелу ў нарадзе былі запрошаны начальнікі раённых упраўленняў сельскай гаспадаркі і харчавання, намеснікі начальнікаў па жывёлагадоўлі, кіраўнікі райплемстанцый, галоўныя ветэрынарныя ўрачы раёнаў, кіраўніцтва і спецыялісты абласных служб і арганізацый.

Непасрэдна на месцах, на малочна-таварных комплексах раёна, была прааналізавана работа па арганізацыі вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі і навядзенню парадку.

Гарачая пара для буракаводаў

У гаспадарках раёна працягваецца ўборка цукровых карэнняў. Па стану на 11 лістапада, з гэтай восеньскай справай поўнасцю справіліся ў закрытым акцыянерным таварыстве «Гудзевічы» і сельгаспрадпрыемстве «Мастаўчанка».

А вось найбольшую ўраджайнасць цукровыя буракі даюць у адкрытым акцыянерным таварыстве «Чарлёна» -- па 720 цэнтнераў з гектара. Валавы збор караняплодаў у гэтай гаспадарцы ўжо склаў 26 910 тон.

Па 630 цэнтнераў з гектара -- такую аддачу ад бурачных пасеваў маюць у філіяле «Дубна» ААТ «Агракамбінат «Скідзельскі». Тут таксама адзін з самых значных валавых збораў цукровых буракоў, які складае 24 639 тон.

Усяго ж па раёну ўжо выкапана 2 087 гектараў цукровых буракоў з 2 295 неабходных. Ураджайнасць цукровай прадукцыі на дадзены час складае 547 цэнтнераў з гектара, валавы збор -- 114 124 тоны. З іх ужо здадзена на цукровы камбінат 93860 тон.

Вядзецца ўздым зяблівa

Асноўныя восеньскія работы ўжо завершаны. Зараз вядзецца падрыхтоўка глебы.

З 15 540 гектараў зяблівa ўжо падрыхтаваны і апрацаваны 12 681 гектар. Добрыя тэмпы гэтай работы забяспечваюць механізатары закрытага акцыянернага таварыства «Гудзевічы» і філіяла «Дубна». Тут праз дзень-другі ўжо завершаць гэтую справу.

Па дадзеных райсельгасхарчу, хімпраполка азімых культур у гаспадарках раёна праведзена на ўсёй неабходнай плошчы, а гэта 9 710 гектараў.

Н. ШЭЎЧЫК

Уважаемые читатели!

ПОДПИСКА-2015

Продолжается подписка на районную газету "Зара над Нёманам" на I полугодие 2015 года.

Цена индивидуальной подписки:
на месяц -- 26 500 рублей.

Цена льготной индивидуальной подписки:
на 3 месяца -- 75 000 рублей.

Подписаться на районную газету можно во всех отделениях почтовой связи, а также у почтальонов.

«Зара над Нёманам» -- это ваша газета.

Подпишитесь -- и узнаете всё о жизни района и о своих земляках.

Оставайтесь с нами!

Духоўнасць

Сэрца мінулага, душа сучаснага, імпульс у будучае

Дзённік жыцця народнага музея баявой славы Лунненскай сярэдняй школы

Наведванне дзяржаўных музеяў Беларусі дае магчымасць людзям вывучаць гісторыю мінулага нашай краіны, у якой адлюстравана памяць народа. У ёй нашы карані, карані сённяшніх з'яў. Нельга зразумець сучаснае жыццё, нельга стварыць будучае, калі не ведаеш мінулага.

Гісторыя захоўвае ў сабе вопыт пакаленняў, вядомыя імёны,подзвігі людзей. Яна часам бывае супярэчлівай , але яна адзіная і другой няма. У дзяржаўных музеях сабрана гісторыя ўсёй Беларусі, але для кожнага патрыёта цікава і важна гісторыя сваёй мясцовасці.

У гэтым дапамагаюць музеі, якія размешчаны на тэрыторыі малой радзімы. Таму наш народны музей баявой славы ДУА " Лунненская сярэдняя школа імя Героя Савецкага Саюза Івана Шарамета " - гэта не проста захавальнік старых рэчаў, якія пакінулі свой след , гэта скарбніца мінулага лунненскага краю, якая ўваходзіць у агульную гісторыю Беларусі.

Школьны народны музей баявой славы (у якім налічваецца каля 1700 экспанатаў) наведваюць за год прыблізна 1200 чалавек. Гэта не толькі беларусы , але і замежныя госці. Рэчы ў ім не проста гавораць, яны "крычаць" ад імя сваіх уладальнікаў і тым самым падтрымліваюць сувязь пакаленняў .

Як удалося сабраць і захаваць гістарычную спадчыну лунненскага краю ? З чаго гэта пачыналася ?

А пачыналася так...

8 лістапада 1957 года ў Лунненскай сярэдняй школе быў адкрыты першы школьны музей у рэспубліцы, які складаўся з сямі аддзелаў. У іх расказвалася пра гераічную барацьбу беларускага народа ў мінулым, пра рэвалюцыйную дзейнасць у перыяд расійскіх рэвалюцый, пра гісторыю КПЗБ, з якой напісана гісторыя лунненскай ячэйкі КПЗБ, пра людзей і іх працу, якія будавалі камунізм.

Па–сапраўднаму захапіла пошукавая работа тады, калі гурткоўцы звярнуліся да старонак гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, таму што не абышла гэта навала і наш лунненскі край. Знойдзены звесткі пра адважнага лётчыка – знішчальніка А.С. Данілава, які здзейсніў паветраны таран у першы дзень вайны, аб адважнай сямёрцы, якая прымала ўдзел пры фарсіраванні ракі Нёман, аб героях, якія прымалі ўдзел у вызваленні Лунна, важнае месца ў экспазіцыі займае гісторыя з піянерскім сцягам. Адным словам, для музея важна ўсё, што звязана з родным краем.

Заснавальнікам музея з'яўляецца настаўнік гісторыі М.У.Сямак.

1959 год – наладжаны сувязі з ветэранамі 127-ага авіяцыйнага палка і 348-й Бабруйскай стралковай дывізіяй, з ветэранамі Лунненскага сельскага Савета.

1961год – за ваенна – патрыятычнае выхаванне музей (адзін з першых у рэспубліцы) заслужыў ганаровае права называцца "Музеем баявой славы."

1963 год – напярэдадні Дня Перамогі музей быў адзначаны журы Усесаюзнага конкурсу на лепшую пастаноўку ваенна-патрыятычнай работы сярод вучняў. Такое высокае прызнанне безумоўна акрыліла краязнаўцаў, натхніла на новыя цікавыя пошукі.

1964год – Лунненскай сярэдняй школе, дзякуючы даследаванням і намаганням вучняў і педагогаў, прысвоена імя Героя Савецкага Саюза Івана Шарамета. На ўрачыстасць, прысвечаную 20-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка – фашысцкіх захопнікаў, запрошаны Героі Савецкага Саюза С.З. Сухін, С.М. Калінін, І.І. Асінны, лётчык-знішчальнік А.С. Данілаў з Аткарска, маці, сястра І. Шарамета з Жытомірскай вобласці, сын Нічапурэнкі з Днепрапятроўска. З героямі і іх сем'ямі наладжаны сувязі, вядзецца перапіска, запісаны ўспаміны. Музей папоўніўся асабістымі рэчамі ўдзельнікаў за вызваленне Лунна.

1965 год – праведзена экспедыцыя "Па месцах баёў 64-й Магілёўскай ордэнаў Суворава і Кутузава стралковай дывізіі". У час экспедыцыі пабывалі на радзіме аднаго з герояў баёў за Лунна С.М Калініна. Ён паведаміў, што пры фарсіраванні ракі Нёман было восем байцоў, але па невядомай прычыне П.Жолудзю не было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Краязнаўцы атрымалі новую тэму для даследавання.

1966 год – вядзецца актыўная перапіска з савецкімі пісьменнікамі, якія ў сваіх творах расказваюць пра патрыятызм і гераізм нашага

народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Экспазіцыя музея папоўнілася кнігамі з аўтографамі Сяргея Смірнова, Канстанціна Сіманава, Максіма Танка, Янкі Брыля і іншымі.

1967 год –музей заняў першае месца ў рэспубліканскім аглядзе работы школьных музеяў.

1970 год - экскурсія ў Брэсцкую крэпасць. Юнакі ўласнымі вачыма пабачылі суровыя, спярэшчаныя слядамі ад куль і снарадных асколкаў бастыёны, дзе кожны метр зямлі паліты крывёй іх абаронцаў. Юныя краязнаўцы прывезлі нямала каштоўных рэчаў для музея – рэшткі зброі, асабістыя рэчы абаронцаў.

1973 год – сабраны матэрыял аб Лунненскай сярэдняй школе, у якім расказваецца аб дырэктарах школы, настаўніках, якія ўнеслі значны ўклад у яе развіццё.

1975 год –паходы па партызанскіх сцежках Скідальшчыны.Галоўнай мэтай паходаў было знаёмства з дзейнасцю скідальскіх камсамольцаў-падпольшчыкаў , што пагеройску загінулі ў верасні 1942 года ў Скідалі. Сярод іх -- І. Шчасны,Ф.Макарчук, І. Сініца. Некаторыя з іх жылі ў вёсках, якія знаходзяцца недалёка ад Лунна,таму выклікалі ў вучняў цікавасць і папоўнілі музей новымі звесткамі і экспанатамі.

1978 год–наладжаны сувязі з беларускім пісьменнікам П. Макалём, які з'яўляўся выхаванцам Лунненскага дзіцячага дома. Адкрыта экспазіцыя, прысвечаная жыццю і творчасці П.Макаля.

1986 год–музею баявой славы школы прысвоена ганаровае званне **народны.**

1988 год – адзначаны шлях 348-й Бабруйскай стралковай дывізіі, якая прымала ўдзел у вызваленні Мастоўшчыны. Краязнаўцы сустрэліся з ветэранамі дывізіі ў пасёлку Вярбілкі Маскоўскай вобласці ў Дзень Перамогі.

1999 год – у музеі сістэматызаваны матэрыял аб 64-й Магілёўскай ордэнаў Суворава і Кутузава стралковай дывізіі, якая вызваляла Лунна. Экспазіцыя папоўнена кнігай Тулякова "64-ая Магілёўская ордэнаў Суворава і Кутузава стралковая дывізія".

2004 год – другое жыццё музея баявой славы ў новым будынку школы.

Адпаведна сучасным мастацкім і навуковым патрабаванням праведзена работа па афармленні экспазіцый:

Старажытныя помнікі лунненскай зямлі.
Гісторыя Лунна.
Побыт нашых продкаў.
Другая сусветная вайна.
Пісьменнікі нашай мясцовасці.

Экспазіцыі музея складваюцца з самых розных матэрыялаў: фотаздымкі, фотаальбомы,дакументы, асабістыя рэчы, паштоўкі і газеты, перапіскі з героямі вайны і вядомымі людзьмі.

Сістэматызаваны матэрыял па экспазіцыі "Ветэраны Лунненскага сельскага Савета". Пасля Вялікай Айчыннай вайны, па дадзеных сельскага Савета, на тэрыторыі Лунна пражывала 170 франтавікоў. З найбольш актыўнымі ветэранамі ўстаноўлена цесная сувязь. З іх вуснаў запісаны ўспаміны аб суровых гадах вайны.

2008 год – музей папоўнены экспазіцыяй "Жыццё і трагедыя яўрэяў, якія пражывалі на Лунненскай зямлі з 16 стагоддзя», у якой паказаны побыт яўрэйскага насельніцтва і прадстаўлены іх трагічны шлях ад Лунна да Асвенцыма.

2009 год – створаны віртуальны музей баявой славы, які мае сваёй мэтай накіраваць наведвальніка на ўспрыманне гісторыі мінулага і сучаснага лунненскай зямлі і канкрэтна Лунненскай СШ, не адыходзячы ад манітора камп'ютара.

2010 год – музею прысвоена ганаровае званне **народны.**

2012 год – адкрыта экспазіцыя "Сучасныя пісьменнікі Лунна" І. Данік- Навуменка, А. Сазанчук, У.Ермакоў звяртаюць увагу на гісторыю лунненскага краю.

2013 год – атрыманы сертыфікат народнага музея баявой славы.

2014 год – адкрыта экспазіцыя, прысвечаная заснавальніку народнага музея баявой славы М.У.Семаку. Зроблены адзін крок наперад годнай, непаўторнай рабоце былога кіраўніка музея. Мсціслаў Уладзіміравіч амаль усё сваё жыццё прысвяціў нялёгкай справе: сабраў разам з вучнямі па крупінках гісторыю мінулага лунненскага краю, а таксама беларускага народа, у якой адлюстравана глыбінная сутнасць, памяць. У экспазіцыі адлюстравана асоба М.У.Семака як заснавальніка музея і Заслужанага настаўніка БССР.

Як бачна, музей існуе дзесяцігоддзі. Ён жыве, таму папаўняецца экспанатамі розных гадоў , рознай тэматыкі і зараз. Музейныя прадметы з'яўляюцца носьбітамі сацыяльнай , гістарычнай і культурнай інфармацыі ва ўстанове адукацыі. Мясцовы краязнаўчы матэрыял як больш блізкі, наглядны дазваляе навучэнцам прасачыць працэс станаўлення і развіцця культуры рэгіёна, праз адзінкавае ўбачыць агульнае. Перад настаўнікамі стаіць важная задача - захаваць цікавасць да работы і экспанатаў музея, далучыць дзяцей да музейнага жыцця праз паходы, экспедыцыі, экскурсіі, якія з'яўляюцца неад'емнай часткай музейнай дзейнасці і асабліва захапляюць школьнікаў.

Сёння актуальнымі з'яўляюцца пошук новых адукацыйных тэхналогій і гатоўнасць педагогаў выкарыстоўваць іх у патрыятычным выхаванні. Інфармацыйнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу музеяў устаноў адукацыі немагчыма без шырокага выкарыстання тэхнічных сродкаў. Наша школа - таксама не выключэнне. Сіламі гурткоўцаў у школе створаны віртуальны музей ДУА " Лунненская сярэдняя школа" і 3D-панарама народнага музея баявой славы. Вучні і педагогі школы прымаюць актыўны ўдзел у навукова-практычных канферэнцыях, конкурсах, выкарыстоўваючы матэрыялы музея.

Для наведвальнікаў музея праводзяцца тэатралізаваныя экскурсіі на беларускай мове і рыхтуецца экскурсія на англійскай мове.

Хочацца выказаць падзяку педагагічнаму калектыву за жыццё музея і асабліва кіраўніку ўстановы адукацыі В.М.Чэрніку, які працягвае традыцыі, што былі закладзены заснавальнікам музея М.У.Семаком. Дырэктар школы прымае актыўны ўдзел ў развіцці музея, заўсёды прытрымліваецца слоў: " Музей -гэта сэрца мінулага, душа сучаснага, імпульс у будучае".

Таму музей жыве і будзе жыць яшчэ доўгія дзесяцігоддзі.

Л. ЭЙСМАНТ,
кіраўнік народнага музея баявой славы

ДОРОГАЯ И ЛЮБИМАЯ ДОЧЕНЬКА, СЕСТРЁНКА, ТЁТЯ МАРИНА АНТОНОВНА РОГАЧЕВСКАЯ!

Красивой женщины красивый юбилей
Наполнит сердце восхищеньем сладостным,
Родная, лет ушедших не жалей,
Пусть каждый день сюрпризом будет радостным!
Пусть пятьдесят улыбок за столом
И пятьдесят пурпурных роз в букете,
Пусть пятьдесят мелодий о былом
Звучат для лучшей женщины на свете!

С любовью мама, сестра, племянники и их семьи

УВАЖАЕМЫЙ АЛЕКСАНДР АЛЕКСАНДРОВИЧ НЕЛЕПКО!

Поздравляем Вас с юбилеем!

Пусть в делах всегда и всюду
Вам сопутствует успех!
И сегодня, в праздник светлый,
Будьте Вы счастливей всех!

Администрация и профком ЗАО «Гудевичи»

УВАЖАЕМЫЙ ЮРИЙ ВЛАДИМИРОВИЧ КАМЕРИСТЫЙ!

На свете дат немало разных,
Но эта дата всех светлей -
У Вас сегодня светлый праздник,
У Вас сегодня юбилей.
И мы сейчас со всей любовью
Вас поздравляем с этим днём,
Желаем доброго здоровья
И счастья личного во всём!

Совет ветеранов Мостовского РОВД

УВАЖАЕМАЯ ЛИЛИЯ ГЕННАДЬЕВНА КЛОЧКО!

Поздравляем Вас с днём рождения!

Желаем радости всегда
И настроенья бодрого,
Не знать печали никогда,
И в жизни всего доброго.
Никогда не унывать,
Не видеть огорчения,
И дни с улыбкой начинать,
Как в этот день рождения!

Коллектив работников Мостовского РОВД

УВАЖАЕМЫЙ ЮРИЙ ВЛАДИМИРОВИЧ КАМЕРИСТЫЙ!

Поздравляем Вас с юбилеем!

Эта круглая в жизни дата -
Ваш торжественный юбилей,
Значит, много от жизни взято,
Ещё больше отдано ей.
Счастья Вам земного,
Радости, чтобы не счесть,
И здоровья желаем много,
Не терялось бы то, что есть!

Коллектив работников Мостовского РОВД

ДАРАГУЮ, ЛЮБІМУЮ, РОДНУЮ МАМАЧКУ ЯНІНУ АДОЛЬФАЎНУ КЛІМУЦЬ

сардэчна віншуем з 70-гадовым юбілеем!
Жадаем моцнага здароўя, добрага настрою, шчасця! Хочацца, каб кожны пражыты дзень прыносіў радасць, удачу, цяпло ў душы.
Мы ўдзячны табе за цярпенне, мудрасць, дабрыню! Ты многа зрабіла для нас, сваіх дзяцей і ўнукаў!

Наша мама можа ўсё і ўсё ўмее -
Аблашчыць, адратуе, зразумее,
Яна і немагчымае ўсё зробіць,
А мы, як зможам, абавязкова зможам, будзем побач!

Два сыны, дзве дачкі і іх сем'і

ДОРОГАЯ МАРИНА АНТОНОВНА РОГАЧЕВСКАЯ!

Поздравляем тебя с юбилеем!

Желаем радости, добра,
Здоровья, счастья и тепла,
Цветов, улыбок и друзей
В весёлый праздник - юбилей!
Красива женщина всегда,
И возраст в этом -- не помеха,
Не забывай в душе хранить
Запасы доброты и смеха,
И пусть не только в этот день
Поёт на сердце соловей!

С уважением семья Севруков

В районной детской библиотеке в игровой комнате «Зелёный остров» почти год сотрудники организовывают дни рождения для именинников и уже проведено 18 таких праздников. С весёлым Клоуном ребята отправляются в волшебную страну Днюрождению, где их ждут увлекательные игры, танцы, сказки и многое другое, а с отважным Пиратом ребят ждёт много приключений и испытаний в поисках клада. Удачным дополнением праздника будет детский батут.

Дети на празднике - не зрители, а увлеченные участники. Они не соревнуются друг с другом - каждый МОЛОДЕЦ! Именинник - в центре внимания, ведь это его праздник.

Отметить день рождения ребенка в сказочной атмосфере с массой всевозможных развлечений может абсолютно каждый! И вопрос: «Где отметить день рождения ребенка в Мостах?» теперь отпадает сам собой!

Ждём вас по адресу: ул. Советская, 19 а, районная детская библиотека, тел. 4-43-49.

Т. ЯРОШУК, заведующая районной детской библиотекой

День рождения ребенка – это самый долгожданный и счастливый день в году для каждого малыша. Это всегда беззаботный, радостный смех и сияние веселых глаз! И как хочется подарить своему сыночку или дочурке незабываемый праздник, наполненный яркими впечатлениями и сюрпризами! Отметить день рождения ребенка дома -- слишком хлопотно и обыденно. В квартире нет веселых клоунов, да и ее размеры не всегда позволяют пригласить всех неугомонных друзей, готовых к играм и прочим безумствам.

Фото предоставлены районной детской библиотекой

Нам.галоўнага рэдактара Наталля Аляксееўна ШЭЎЧЫК

Зара над Нёманам
Мастоўская раённая газета.
Газета выходзіць у сераду і суботу.
У тыдзень выпускаецца два нумары.
Выдаецца ў г.Масты, Гродзенскай вобласці, Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: раённы выканаўчы камітэт, раённы Савет дэпутатаў, працоўны калектыў рэдакцыі.
Рэг. пасв. №1214 ад 8 лютага 2010 года.
Аб'ём газеты -- 2 друкаваныя аркушы.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 231600, г.Масты, вул.Савецкая,34 Індэкс 64033

ТЭЛЕФОНЫ: галоўнага рэдактара --3-21-65, нам. гал. рэдактара -- 3-24-33, адк. сакратара -- 3-22-29, аддзела пісьмаў-- 3-33-45, аддзела сац.-эканамічнага развіцця -- 3-35-85, бухгалтэрыі і аддзела рэкламы -- 3-35-23, камп'ютарнага цэнтра -- 3-23-17, аддзела радыёвяшчання -- 6-13-57.

Наш сайт у інтэрнэце: http: //www.mosty-zara.by
Электронная пошта E-mail адрас: zarja@mail. grodno. by

ISSN 2218-919X

Набор і вёрстка камп'ютарнага цэнтра "Зары над Нёманам"
Газета надрукавана афсетным спосабам у ГАУПП "Гродзенская друкарня": 230003, г.Гродна, 3, вул. Паліграфістаў, 4. Разл.рахунак рэдакцыі №301524009011, РКЦ №10 у горадзе Масты філіяла ААТ «Белаграпрамбанк» -Гродзенскае абласное ўпраўленне, код банка 457, УНП 500126806, ОКПО 02478504.
Падпісана да друку ў 10.00. Тыр. 4376 Зак. 6786

Адказнасць за падбор і выкладанне фактаў нясуць аўтары публікацый. Выказаныя ў іх думкі могуць не супадаць з пунктам гледжання рэдакцыі і не накладваюць на яе ніякіх абавязкаў.
За змест аб'яў і іншай рэкламы рэдакцыя не адказвае. Усе даведкі ў рэкламадаўцаў.